■ Кінагід

«ЛІСТАПАД-2013»: ХОЧАЦЦА ЖЫЦЬ

Дзівосы кінафестывалю, які набліжаецца

Фестывалі ў нашай краіне — гэта не толькі святы мастацтва, на якія ў дзяржавы чамусьці заўжды не хапае грошай, але яшчэ і само мастацтва. Якім кіно здзівіць Мінскі міжнародны кінафестываль «Лістапад» на гэты раз?

1. «Параджанаў» (рэж. Серж Аведзікян, Алена Фяцісава).

Праграма кінафестывалю ў цэлым абяцае быць вельмі насычанай. Самы першы фільм, які пабачаць мінская публіка, — біяграфічная драма «Параджанаў». Няпростая стужка пра лёс няпростага, невыпадковага ў гэтым свеце чалавека — рэжысёра Сяргея Параджанава, які нарадзіўся ў Грузіі, адседзеў турэмны тэрмін ва Украіне, памёр у Арменіі... Нездарма ўкраінскі рэжысёр Алена Фяцісава распрацавала гэты кінапраект у рамках Еўрапейскай прадзюсарскай праграмы EAVE. Наогул, для ўкраінскага кіно гэта ўнікальны выпадак супрадукцыі. Нам ёсць чаму павучыцца. У ролі самога Параджанава — яго сябра Серж Аведзікян, які ўжо шмат гадоў жыве ў Францыі. Мяркуецца, што здымачная група карціны «Параджанаў» прыедзе на беларускі кінафестываль. А ўжо адно тое, што гэты фільм намінаваны ад суседняй Украіны на адну з самых прэстыжных кінапрэмій свету «Оскар», прымушае не пакінуць яго без увагі.

1 лістапада, к/т «Цэнтральны», 12.00.

2 лістапада, к/т «Дом кіно», 17.00.

2. «Вечнае вяртанне» (рэж. Кіра Муратава).

Адзін з самых вядомых і спрэчных украінскіх рэжысёраў сучаснасці Кіра Муратава ў 2009 годзе прыязджала на «Лістапад» з фільмам «Мелодыя для катрынкі». Тады яе фільм атрымаў прыз журы кінапрэсы і сабраў поўную залу кінатэатра «Дом кіно». Людзі сядзелі на прыступках, студэнтаў прапускалі сядзець на падлозе бясплатна. Словам, перааншлаг па поўнай праграме. Ёсць вялікае падазрэнне, што сёлета адбудзецца тое самае. Новы фільм Муратавай, прэм'ера якога, дарэчы, адбылася на Рымскім кінафестывалі летась, паспелі ўжо ахрысціць па-за ўсялякімі жанрамі. Маўляў, набор варыяцый, тэм, жэстаў, эмоцый. Усяго таго, за што адны рэжысёра любяць, а іншыя — ушчуваюць. Рэната Ліцвінава, Алег Табакоў, Ала Дзямідава, Сяргей Макавецкі ў галоўных ролях; музыка Земфіры. Што тут яшчэ скажаш?

6 лістапада, к/т «Цэнтральны», 18.30.

3. «Географ глобус прапіў» (рэж. Аляксандр Велядзінскі).

Паводле ўсіх беларускіх кіношных апытанак, гэты фільм з'яўляецца адным з самых чаканых фільмаў у беларускіх гледачоў. І «Лістапад» дае магчымасць нарэшце паглядзець фільм на вялікім экране! «Географ глобус прапіў» — экранізацыя аднайменнага рамана Аляксея Іванова. Праўда, дзеянне фільма перанесена з «ліхіх 90-х» (раман быў напісаны ў 1995-м) у нашы дні. Што, бясспрэчна, прыцягвае да яго яшчэ больш увагі. Фільм пра адчуванне бясконцай адзіноты біёлага, які ўладкаваўся працаваць настаўнікам геаграфіі, атрымаў галоўны прыз Адкрытага расійскага кінафестывалю «Кінатаўр» у Сочы. А гэта ўжо сведчыць пра пэўны мастацкі ўзровень.

7 лістапада, к/т «Цэнтральны», 14.00; к/т «Дом кіно», 19.30.

4. «Жыццё Адэлі» (рэж. Абдэлатыф Кешыш).

Адзін з самых нашумелых фільмаў апошняга года, уладальнік Залатой пальмавай галінкі сёлетняга Канскага кінафестывалю. Мы можам толькі ганарыцца, што на беларускім кінафестывалі паказваюць фільмы такога ўзроўню якасці, таленту, спрэчнасці. «Жыццё Адэлі» пакажуць у пазаконкурснай праграме «Майстар-клас». Дарэчы, у кампаніі іншых цікавых стужак. Напрыклад, «Боргман (Парушальнік спакою)» Алекса Ван Вармердама; «Паляванне» Томаса Вінтэнберга, паплечніка скандальнага дацкага генія Ларса фон Трыера па «Догме-95»; трылогію аўстрыйца Ульрыха Зайдля «Рай»: «Любоў», «Вера», «Надзея»; «Вялікая прыгажосць» італьянца Паола Сарэнціна.

«Жыццё Адэлі» — фільм пра сексуальнасць, сталенне і ракавое... лесбійскае каханне. Гэта першая стужка французскага рэжысёра Абдэлатыфа Кешыша, якая атрымала такую вядомасць. Хаця раней яго фільм «Ухіленне» атрымаў у 2003 годзе прэстыжную прэмію «Сезар» за найлепшы фільм, сцэнарый і рэжысуру, а фільм «Кус-Кус і барабулька» прэмію ФІПРЭСІ Венецыянскага кінафестывалю ў 2007 годзе. Так што Кешыша можна смела лічыць трэндавым рэжысёрам.

8 лістапада, к/т «Дом кіно», 21.00.

5. Рэтраспектыва фільмаў французскага рэжысёра Клэр Дэні.

Цэлых 9 фільмаў Клэр Дэні пакажуць у рамках лістападаўскай рэтраспектывы рэжысёра пры падтрымцы Пасольства Францыі ў Беларусі, Французскага інстытута і асацыяцыі «Юніфранс»: «Пляваць на смерць» (1989), «Не магу заснуць» (1994), «Добрая праца» (1999), «Што ні дзень, то непрыемнасці» (2001), «Нечаканы госць» (2004), «Да Матыльды» (2005), «35 чарак рому» (2008), «Белы матэрыял» (2009), «Слаўныя выраднкі» (2013).

На рэтраспектыву Клэр Дэні варта схадзіць па некалькіх прычынах. Па-першае, яна дачка адміністратара ў французскіх калоніях і вырасла ў Афрыцы, што вельмі яскрава адчуваецца па яе фільмах. Па-другое, яна працавала асістэнтам у такіх вядомых прадстаўнікоў аўтарскага кінематографа, як Жак Рывет, Вім Вэндэрс, Джым Джармуш, Рабэр Энрыко, Душан Макавееў ды іншых. Па-трэцяе, назвы яе фільмаў настолькі простыя і побытавыя, што калі вы паспрабуеце знайсці і спампаваць іх па лакальнай камп'ютарнай сетцы, то ў вас нічога не атрымаецца. А таму прыходзьце на «Лістапад» у кінатэатр «Перамога», у якім, уласна, і адбудзецца рэтраспектыва.

❑ ❑ ❑

Акрамя гэтых фільмаў, вядома, на «Лістападзе» будзе яшчэ шмат чаго цікавага. Напрыклад, фільм паляка Паўла Паўлікоўскага «Ida», прэм'ера якога адбылася на кінафестывалі ў Таронта, распавядае пра Польшчу, халакост, вайну, манаства. Паўлікоўскі жыве і паспяхова працуе ў Вялікабрытаніі. «Ida» — яго першы польскамоўны фільм.

Альбо «Старлетка» Шона Бэйкера, якую паказуць па-за конкурсам у праграме «Новы ўзрост». У ёй здымалася праўнучка Эрнэста Хэмінгуэя — Дры Хэмінгуэй.

А таксама «Хочацца жыць» Мацея Пепжыца, «Калі ў Бухарэсце наступае вечар, альбо Метабалізм» Карнэліу Парумбоя, «Сын у бацьку» Хіракадзу Корэ-Эда ды іншыя.

Беларусь у асноўным конкурсе ігравога кіно будзе прадстаўляць фільм Канстанціна Лапушанскага «Роля» (сумесная вытворчасць кінастудый «Беларусьфільм» і «Ленфільм»). Рэцэнзія на гэты фільм ўжо друкавалася ў «Звяздзе» пэўны час таму.

Сачыце за раскладам і глядзіце толькі якаснае кіно!

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ

ШАШКІ

Пад рэдакцыяй міжнароднага арбітра Мікалая ГРУШЭЎСКАГА

ДРУГІ Ў СВЕЦЕ

Аляксандр Кагоцька, які пераехаў на месца жыхарства з Пінска ў Бабруйск, з'яўляецца суддзёй нацыянальнай катэгорыі па мотаболе (на фота). А яшчэ ён вядомы ў шашачнай кампазіцыі: ФМЖД прысвоіла яму званне міжнароднага майстра за паспяховыя выступленні ў спаборніцтвах. Самы значны вынік ён паказаў у ЧС-1 2012 года ў раздзеле камбінацыйных праблем-64, дзе заваяваў сярэбраны медаль. Вам прыемна будзе пазнаёміцца з яго лепшым творам у гэтым прэстыжным чэмпіянаце:



Белыя: b4, b6, c5, c7, d6, e5, e7, g3, g5 (9). **Чорныя**: a5, a7, b2, c3, d2, e3, f4, g7, h2, h6, h8 (11). 79,67 ачка ў катэгорыі Д: b8, f8, b6, f2!!, e1 (h6:f4) e3, a3 (g7) b2 (h6) c3 (g5) d2 (h4) e1 (b4, g3) b6, g1+.

АЎТАРСКІ-18

Віктар Шульга праводзіць яго на свае прызы. Віктар — наш пастаянны аўтар. Ён з'яўляецца першым міжнародным майстрам па шашачнай кампазіцыі сярод беларускіх праблемістаў. У чарговых заданнях белыя пачынаюць і выйграюць:

№ 18/11. **Белыя**: a3, d2, e3, e5, f2, f6, g5, g7, h2 (9). **Чорныя**: a7, b4, b6, c3, c5, d8, e7, h8 (8).

№ 18/12. **Белыя**: f2, g7, дамка h6 (3). **Чорныя**: a5, b4, c5, e5, h4(5).



№ 18/13. **Белыя**: 11, 19, 23, 26, 27, 29, 31, 38, 48, 49, 50 (11). **Чорныя**: 2, 7, 12, 16, 18, 30, 35, 36, 39, 40, 44 (11).

❑ ❑ ❑

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас: **220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі».**

АБСАЛЮТНЫ ПЕРАМОЖЦА

Вынікі «бліцаў»-51-64 і некаторых іншых конкурсаў асобна не падводзіліся, бо не на ўсе заданні атрыманы дакладныя адказы. У агульным жа заліку лепшых паказчыкаў дасягнуў Аляксандр Белы (Наваполацк), які стаў абсалютным пераможцам. Яго чакае сюрпрыз з заахвочвальнага фонду чэмпіёна свету па шашачнай кампазіцыі Пятра Шклудава.

РАШЭННІ

«Аўтарскі-19» (Д. Камчыцкі): **19/5** — ed6, d8, e7, c1 (g3) e3x, **19/6** — fe5, e7, bc5, a5 (g5) e3 (h4) f4 x, **19/7** — f6, f8, a3, d6 (e7, g3) c5 (h2) g1 (g5) ab6 x і **19/8** — f6, d2, a1, c3 (b2) b4, c3x.

АД ІМЯ ЗЕМЛЯКОЎ

Наша шчырае віншаванне знакамітаму земляку **Уладзіміру Паўлавічу ВЯЛІЧКУ з нагоды 70-годдзя з дня нараджэння**. Вядомаму журналісту і філосафу, проста цудоўнаму чалавеку (творчасць якога па заслугах ацаніў народны пісьменнік Беларусі Іван Шамякін) мы жадаем шырокага прастору думак і пачуццяў, прыемнага застолля ў дзень сямейнага свята, новых ідэй у імя росквіту любай Айчыны, сонечнага зямнога шчасця і актыўнага даўгалецця.

Ад імя землякоў Пётр Міхайлавіч ЛІШ, дырэктар ААТ «Радзіма» Пружанскага раёна.

УНП 200026602.

Даты Падзеі Людзі

Дзень памяці ахвяр палітычных рэпрэсій.

1728 год — 285 гадоў таму нарадзіўся (вёска Саломенка, цяпер Гродзенскі раён) Марцін Пачобут-Адляніцкі, беларускі астраном, асветнік, член Лонданскага каралеўскага таварыства (1770), член-карэспандэнт Парыжскай АН (1778). Вучыўся ў Гродзенскім і Полацкім езуіцкіх калегіумах і Віленскай езуіцкай акадэміі. Удасканальваў адукацыю ў Рыме, Лондане, Парыжы і іншых гарадах Еўропы. Выкладаў у Полацку старажытнагрэчаскую мову. Адзін з арганізатараў і першы дырэктар (1765-1807) Віленскай астранамічнай абсерваторыі. З 1764 года — прафесар Віленскай акадэміі, адначасова — рэктар Галоўнай школы ВКЛ. Вёў сістэматычныя назіранні за зоркамі і планетамі, выявіў невядомае сузор'е. Вызначыў геаграфічныя каардынаты Вільні, Гродна і іншых гарадоў. Унёс значны ўклад у развіццё асветы і папулярызацыю прыродазнаўства і матэматыкі, актыўна працаваў у Адукацыйнай камісіі. Яго імем названы адзін з кратараў на адваротным баку Месяца. Памёр у 1810 годзе.

1921 год — у Мінску адкрыты Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. У яго стварэнні ўдзельнічалі акадэмік Я. Карскі, прафесары В. Волгін, У. Пічэта і іншыя. У першы навучальны год да заняткаў прыступілі 1250 студэнтаў. Першым рэктарам БДУ быў Уладзімір Іванавіч Пічэта. Сёння ўніверсітэт мае статус вядучай вышэйшай навучальнай установы ў нацыянальнай сістэме адукацыі і ажыццяўляе падрыхтоўку спецыялістаў у рамках сістэмы вышэйшай і дадатковай адукацыі, бакалаўрыяту, магістратуры, аспірантуры і дактарантуры. Ён прызнаны як вучэбна-метадычны і навуковы цэнтр, які аб'ядноўвае дзеяздольныя і эфектыўныя педагагічныя школы розных напрамкаў гуманітарных і прыродазнаўчых ведаў. Навучанне ажыццяўляецца ў дзённай, вячэрняй і завочнай формах, а па некаторых спецыяльнасцях таксама ў парадку экстэрнату. Універсітэт з'яўляецца не толькі вядучым вучэбным, але і буйным навуковым цэнтрам. На рахунку вучоных БДУ шмат навуковых адкрыццяў і вынаходак. Яны ўнеслі вялікі ўклад у сусветную навуку. БДУ з'яўляецца членам Еўрапейскай і еўраазіяцкіх асацыяцый універсітэтаў, адным з заснавальнікаў Міжнароднай сеткі ўніверсітэтаў Еўропы і Цэнтральнай Азіі.

1936 — нарадзіўся (вёска Кунцаўшчына Гродзенскага раёна) Генадзь Цыхун, беларускі моваznаўца, славіст, доктар філалагічных навук (1982), прафесар (1996). Аўтар даследаванняў па тыпалогіі славянскіх моў і іх сувязяў, змешаных формаў гаворкі. Работы ў галіне арэальнай лінгвістыкі, дыялекталогіі Палесся, беларускай этымалогіі і гісторыі беларускай моваznаўчай славістыкі. Аўтар манаграфій «Тыпалагічныя праблемы балканаславянскага моўнага арэала», «Арэальскія аспекты фарміравання славянскіх літаратурных моў» і іншых.

Было сказана

Янка КУПАЛА, народны паэт Беларусі:

«Само сонца ўзяць у рукі
І, як з паходняй, з ім ісці».

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



ПРАВЕРЦЕ, ХАЦІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Па гарызанталі: Зёмка. Ушчыльніць. Пасад. Порт. Ірга. Апалка. Мэн. Лімакад. Апока. Армія. Кана. Туга. Ка. Хустка. Нагата. Рог. Бов. Кулак. Цукар. Муг. Сага. Кірпіч. Пальк. Рана. Агор. Катлета. Эрмітаж.

Па вертыкалі: Метранапітэн. Амур. Рыжмар. Анабіёз. Юнак. Тора. Пуўр. Арав. Кара. «Дзяка». Анцыпат. Пагар. Самум. Звяно. Умора. Кара. «Дзяка». Кок. Гуру. «Амок». Кастрама. Кран. Конус. Гурбка. Ачаг. Радавень.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	8.06	17.40	9.34
Віцебск	7.59	17.26	9.27
Магілёў	7.56	17.30	9.34
Гомель	7.49	17.31	9.42
Гродна	8.20	17.55	9.35
Брэст	8.17	18.00	9.43

Месяц

Апошняя квадра 27 кастрычніка. Месяц у сузор'і Дзевы.

Імяніны

Пр. *Аляксандра, Андрэя, Антона, Дзям'яна, Кузьмы.*

К. *Анжэлы, Андрэя, Эдмунда.*

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ЗАЎТРА



...у суседзяў

ВАРШАВА +10..+12°С	КІЕЎ +12..+14°С	РЫГА +9..+11°С
ВІЛЬНЮС +8..+10°С	МАСКВА +8..+10°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ +7..+9°С

УСМІХНЕМСЯ

З дзённіка халасцяка:

«Збіраюся ў госці. Стаю перад выбарам: або адна шкарпэтка з дзвюх дзіравая, або абедзве цэлыя, але розныя».

Сантэхнік Сідараў пасля прачысткі калектара прачытаў жыхарам дома ненарматыўную лекцыю аб правілах карыстання каналізацыяй.

— Па статыстыцы, народным лекарам давяраюць не менш, чым урачам.

— А чаму тады да іх менш ходзяць?

— Яны бальнічных не выпісваюць.

Гоша Куцэнка і Фёдар Бандарчук, на першы погляд, такія розныя людзі.

Але калі паглядзець на іх зверху, нават родная маці не адрозніць.

carlcatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н.КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара—галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С.РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by,

(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 23.185. Індэкс 63850. Зак. № 649.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 29 кастрычніка 2013 года.